**Майстар-клас настаўніка**
**беларускай мовы і літаратуры ДУА "Гімназія г.Пружаны"Кнігі Галіны Паўлаўны**
**Тэма:**
«Праектна-даследчая дзейнасць вучняў як эфектыўны сродак іх інтэлектуальнага і творчага развіцця»
**Мэта:**
расшырыць прафесійныя веды і практычныя навыкі педагогаў ў галіне прымянення праектна-даследчых метадаў навучання".
**Задачы:**
**1.** Папулярызацыя праектна-даследчых метадаў арганізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў, метадычных знаходак у практыцы выкарыстання праектна-даследчых метадаў на ўроках і ў пазакласнай дзейнасці;
2. Распаўсюджанне вопыту па прымяненні праектна-даследчых метадаў у адукацыйным працэсе як сродку развіцця інтэлектуальнага і творчага патэнцыялу вучняў;
3. Аказанне дапамогі ўдзельнікам майстар-класа ў практычным авалоданні праектна-даследчымі метадамі.
**План правядзення:**
1. Знаёмства з планам майстар-класа, пагружэнне ў праблему.
2. Праектна-даследчая дзейнасць у школе (абаснаванне ідэй праектна-даследчых тэхналогій).
3. Прэзентацыя педагагічнага вопыту педагога-майстра па тэме "Праектна-даследчая дзейнасць вучняў як эфектыўны сродак іх інтэлектуальнага і творчага развіцця".
4. Характарыстыка дасягненняў педагога ў вобласці прымянення праектна-даследчых тэхналогій на ўроках і ў пазакласнай дзейнасці.
5. Вызначэнне праблем і перспектыў у рабоце педагога-майстра.
6. Дзелавая гульня для ўдзельнікаў майстар-класа "Мадэляванне структуры і зместу вучэбнага даследавання".
7. Падвядзенне вынікаў  работы, рэфлексія.

***1.*** **Знаёмства з аўдыторыяй, знаёмства з планам майстар-плана.***(Педагогі ўваходзяць і ім уручаецца візітка настаўніка розных колераў, фарміруюцца тры працоўныя групы настаўнікаў : зялёная, чырвоная, сіняя)*

Добры дзень, паважаныя сябры! Я рада вас вітаць і спадзяюся на сумесную паспяховую і плённую калектыўную работу. Мы сёння будзем працаваць у групах, і вы бачыце, што гэтыя групы ўжо сфарміраваліся. Давайце для таго, каб настроіцца на пазітыўны лад, каб працаваць зладжана і рэзультатыўна, мы з вамі выканаем практыкаванне "Дрэва дасягненняў".

Перад вамі лісточкі трох колераў. Калі вы лічыце, што дасягнулі поспехаў у прафесійнай дзейнасці, у рабоце - прымацуйце на дрэва чырвоны лісточак.

Калі вы навучыліся пасяхова дзяліцца сваім думкамі адзін з адным, то прымацуйце лісточкі зялёнага колеру.

Калі вы дасягнулі поспехаў у асабістым жыцці, то прымацуйце лісточкі жоўтага колеру.

- *Абмеркаванне: якіх лісточкаў на нашым дрэве болей? Чаго дасягнуў наш калектыў?*

Такім чынам, наша дрэва дасягненняў атрымалася даволі яркае: значыць, у нас з вамі ўжо нямала дасягненняў у розных сферах. І мне хочацца, каб нашы дасягненні ў прафесійнай дзейнасці сталі яшчэ больш значнымі, і я спадзяюся, што наш сённяшні занятак у гэтым вам дапаможа.

Паважаныя калегі, эпіграфам майстра-класа я выбрала словы Васілія Аляксандравіча Сухамлінскага: "**Праблема творчасці - адзін з участкаў педагагічнай цаліны".**

- *І мне хацелася б пачуць, як вы разумееце гэтыя словы*.(*Абмеркаванне).*

Педагогі нашай гімназіі на гэтае пытанне таксама далі цікавыя адказы:
"настаўнік павінен тварыць, а не капіраваць";
"настаўнік павінен быць творцам, а не раменнікам";
"незалежна ад працоўнага стажа, заходзячы ў адзін і той жа клас, бачачы адны і тыя ж дзіцячыя вочы, ты павінен кожны раз знаходзіць магчымасць зацікавіць, захапіць, дапамагчы ўвесці рабят у адукацыйны працэс"";
"грамадству патрэбны творчыя, крэатыўныяасобы, а развіваць гэта трэбаў школе".

- *А як фарміраваць і развіваць творчую асобу вучня?*
- *Як навучыць рабят працаваць не толькі па ўзору ці па шаблоне, а навучыць іх мысліць, аналізаваць?*
- *Як сфарміраваць у вучнях тыя асноўныя канцэпцыі, якія накіраваны на самаразвіццё і самарэалізацыю, на развіццё пазнавальных патрэбнасцей, умення арыентавацца ў сучаснай інфармацыйнай прасторы, прадуктыўна працаваць, эфектыўна супрацоўнічаць, адэкватна ацэньваць сябе і свае дасягненні?*

Я цвёрда ўпэўнена, што рашыць гэтыя задачы, выкарыстоўваючы толькі традыцыйную класна-ўрочную сістэму, толькі рэпрадуктыўныя метады навучання, нельга.

Я на практыцы ўпэўнілася, што выкарыстанне элементаў праблемных, пошукавых, праетна-даследчых метадаў робіць навучанне больш прадуктыўным.

Развіццё даследчых уменняў і навыкаў вучняў дапамагае дасягнуць некаторых мэт:

-падняць цікавасць вучняў да вучобы;

- матываваць іх на дасягненне больш высокіх рэзультатаў.

Акрамя таго, праектна-даследчыя метады я даўно прымяняю і пры арганізацыі пазакласнай працы з вучнямі. Гэта дазваляе рэалізаваць асабісты творчы і інтэлектуальны патэнцыял вучняў у навукова-даследчай дзейнасці.

Таму, паважаныя калегі, я хачу сёння з вамі падзяліцца сваім вопытам па выкарыстанні на практыцы менавіта праектна-даследчых метадаў навучання і тэма майго майстар-класа:

«Праектна-даследчая дзейнасць вучняў як эфектыўны сродак іх інтэлектуальнага і творчага развіцця".

У час занятку я пастараюся пашырыць вашы прафесійныя веды і практычныя ўменні ў галіне прымянення праектна-даследчых метадаў навучання.
- *А чаго вы чакаеце ад нашай сустрэчы, паважаныя калегі?(Адказы)*
Я пастараюся вашы надзеі апраўдаць. І мы пачынаем.

2. **Праектна-даследчая дзейнасць у школе (абаснаванне ідэй праектна-даследчай тэхналогіі)**

У маёй прафесійнай дзейнасці прысутнічае навізна ў пошуку метадычных прыёмаў, метадаў і сродкаў навучання, неабходных для стварэння фарміравання творчай асобы. Менавіта таму найбольш часта прымяняю метады навучання, якія адносяцца да метадаў навучання, што развіваюць асобу:

- праблемнае навучанне;
- часткова-пошукавыя метады;
- праектна-даследчыя метады.

Роля настаўніка ў працэсе прымянення праектна-даследчых метадаў заключаецца перш за ўсё ў пабудове такіх заданняў, якія забяспечылі б творчае прымяненне вучнямі асноўных ведаў.

Акрамя таго, настаўнік павінен кантраляваць ход работы вучняў, накіроўваць яе ў выпадку адхілення іх ад правільнага шляху, правяраць вынікі работы, арганізаваць іх абмеркаванне.

На ўроках беларускай мовы ў 5-7 класах набыццё прасцейшых ведаў, уменняў і навыкаў, неабходных для выканання даследчай работы я ажыццяўляю праз навучанне асновам самастойнай дзейнасці, развіццю нестандартнага мыслення.

На дадзеным этапе важна навучыць дзяцей арыентавацца ў матэрыяле самастойна, вылучаць асноўнае, ацэньваць і ставіць пытанні. Важна развіваць навыкі рашэння праблемнай сітуацыі, крытычнае мысленне. У якасці прыкладу прывяду наступныя метады:

1. У канцы ўрока прапаную вучням падумаць над пачутым у час заняткаў і адказаць на пытанні:

-Што з'яўляецца асноўным з усяго матэрыялу, які вывучаўся на ўроку сёння? Якую інфармацыю па гэтым пытанні вы хацелі б атрымаць дадаткова?

2. Прапаную выбраць тэму, якая патрабуе аналізу, разваг. Вучням трэба ў групах абмеркаваць праблему і адказаць на пытанні.

3. Дастаткова эфектыўна выкарыстоўваю прыёмы тэхналогіі крытычнага мыслення: сатаўленне кластара, выкарыстанне табліц, сінтэзаванне інфармацыі з дапамогай сінквейна.

У 8-11 класах я практыкую выкананне самастойных даследаванняў і заданняў творчага, параўляльнага характару. Напрыклад:

- заданні параўнальнага аналізу моўнага матэрыялу;
- заданні, якія патрабуюць крытычнага мыслення, разважанняў;
- заданні, якія патрабуюць сінтэзу матэрыялу, фармулявання вывадаў.

Даследчую дзейнасць на ўроках беларускай літаратуры я разглядаю з двух бакоў:
як метад выкладання і як узровень, да якога могуць падняцца школьнікі ў сваёй дзейнасці.
У сваёй практыцы я ў залежнасці ад узроставых груп прымяняю наступныя метады актывізацыі пазнавальнай дзейнасці.
1. Markdown-safe: Рознабаковасць жанраў урокаў:
ролевыя гульні (*можна ва ўсіх класах*);
урокі - літаратурна-музыкальныя кампазіцыі. (Састаўленне вучнямі самастойна з размежаваннем роляў: падбор літаратурнага матэрыялу, бібліяграфічных звестак,

музычнага суправаджэнне, афармленне ўрока ілюстрацыямі). (Прымяняецца пераважна ў 7-11 класах);
урокі-даследаванні (5-11 класы);
урокі-праекты (8-11 класы);
урок-творчая справаздача (5-11 класы;
урок-семінар (9-11 класы);
урок-разважанне (8-11 класы);
урок-канферэнцыя (9-11 класы);
2. Слоўнікавая работа (5-11 класы): састаўленне тэматычных слоўнікаў на аснове творчасці паэта, пісьменніка; састаўленне слоўніка неалагізмаў; састаўленне слоўніка дыялектных слоў;
3. Пастаноўка праблемных пытанняў і рашэнне праблемных сітуацый (на ўсіх этапах вывучэння літаратуры);
4. Пошукава-дыялагічны метад (6-11). Тут маецца на ўвазе ўменне вядзення праблемнага дыялогу, падчас якога вучні самастойна адкрываюць агульную праблему, якая мае непасрэныя адносіны да дальнейшай работы. Праблемны дыялог ператварае навучанне ў творчы працэс.
- *Паважаныя калегі! Давайце сумесна падвядзём вынікі.*
Прымяненне праектна-даследчых метадаў садзейнічае развіццю вучняў.

- У чым гэта, на вашу думку, выражаецца? Якія якасці развіваюцца ў вучняў пры прымяненні праектна-даследчых метадаў?

- І зробім гэта ў выглядзе кластара. У вас на сталах ляжаць каляровыя палоскі, у працэсе калектыўнага абмеркавання напішыце на іх вашы меркаванні.
*(Абмеркаванне ў групах, састаўленне кластара).*
Прагназуемыя адказы:

- фарміраванне даследчых навыкаў;
- развіццё аналітычных уменняў;
- фарміраванне навыкаў самастойнай работы;
- фарміраванне навыкаў самааналізу і самадыягностыкі;
- вучні асвойваюць навыкі работы з рознымі крыніцамі інфармацыі;
- развіццё творчага патэнцыялу;
- расшырэнне ведаў у той ці іншай вобласці і інш.

Менавіта ў гэтым я бачу калі не перавагу, то вартасць праектна-даследчых метадаў: яны садзейнічаюць развіццю інтэлектуальнага і творчага патэнцыялу вучняў.

Праектна-даследчыя метады я выкарыстоўваю не толькі на ўроках. Больш за 10 гадоў я практыкую арганізацыю праетна-даследчай дзейнасці з вучнямі ў пазакласнай рабоце. І за гэты час я ўпэўнілася, што прыцягненне вучняў да стварэння вучэбных і творчых праектаў – гэта найбольш эфектыўны спосаб павышэння вучэбнай матывацыі, развіцця пазнавальных інтарэсаў і асабістых якасцей, пашырэнне іх кругазору, а значыць, развіцця творчай асобы вучня.

Праектна-даследчай дзейнасцю са сваімі выхаванцамі я займаюся з 2004 года і за гэты час мы з вучнямі распрацавалі 22 творчыя і вучэбна-даследчыя праекты і дасягнулі значных рэзультатаў:(*на экране па гадах дасягненні):*

- Рэспубліканскі фальклорна-этнаграфічны конкурс "Дзень Зямлі -2005" - Дыплом І ступені;
- Абласная НПК, навукова-даследчая работа "Маці казала так..." - Дыплом ІІ ступені;
- Міжнародная канферэнцыя "Агульнасць народаў - агульнасць культур" – Дыплом ІІІ ступені;

- Рэспубліканскі конкурс навукова-даследчых  і творчых работ, абвешчаны часопісам "Роднае слова" - 9 дыпломаў у розных намінацыях;
- Рэспубліканскі конкурс "Радзіма мая дарагая" – Дыплом ІІІ ступені;
- Абласная НПК,навукова-даследчая работа "Тапонімы і антрапонімы в.Бакуны ў свеце сучаснасці" - Дыплом ІІ ступені;
- Міжнародная НПК "Біблейскія сюжэты ў сусветным мастацтве" – Дыплом ІІІ ступені;
- Рэспубліканскі конкурс "Праз творчасць у прафесію жыцця" -  Дыплом ІІІ ступені.

Асобнае месца ў маёй практыцы займаюць творчыя праекты, якія звязаны з творчымі людзьмі, з таленавітымі яркімі асобамі, якія жывуць на нашай Пружанскай зямлі. Мы з вучнямі здымаем пра іх фільмы, вывучаем іх жыццёвы шлях, бяром у іх інтэрв'ю. І з усяго гэтага часцей за ўсё атрымліваюцца відэапраекты. Намі было распрацавана 4 такіх праекты:

"Сённяшнія творцы нацыянальных традыцый";
"Людзі, якія ствараюць прыгажосць";
"Творца сучаснай гісторыі";
"Мае землякі - мой гонар".
І зараз я прапаную вашай увазе фрагмент відэапраекта
"Сённяшнія творцы нацыянальных традыцый"; (ф*рагмент відэа***).**

Гэта нашы поспехі і дасягненні. А як дабіцца такога рэзультату, каб прыцягнуць увагу вучняў да распрацоўкі праектаў, як выбраць тэму і форму праекта?. Гэтыя і іншыя пытанні, я думаю, зараз узніклі ў вас, паважаныя калегі.

І менавіта вопытам па арганізацыі праектна-даследчай дзейнасці з вучнямі ў пазакласны час я хачу з вамі падзяліцца. І калі атрымаецца,  дапамагчы вам ў асваенні тэарэтычных  і метадычных асноў арганізацыі дадзенай дзейнасці.

- *Так што ж такое праектна-даследчая дзейнасць, з чаго яна складаецца?*

Праектна-даследчая дзейнасць - дзейнасць па праектаванню асабістага даследавання, якая мае на ўвазе вылучэнне мэт і задач, падбору метадаў даследавання, планаванне ходу даследавання, вызначэнне рэзультатаў, якіх жадаеш.

Асноўнае адрозненне пректна-даследчай дзейнасці ад навуковай у тым, што ў выніку вучні не адкрываюць новыя веды, а атрымліваюць навыкі даследавання, развіваюцца здольнасці да даследавання тыпу мышлення, актывізуецца пазіцыя вучня як асобы.

- *Якая ж структура вучэбнага даследавання?*

Я прапаную ў працэсе калектыўнага абмеркавання стварыць у патрэбнай паслядоўнасці асноўныя этапы праектна-даследчай дзейнасці. Праект можна разглядаць як 5 “П”.

1. П - …
2. П - …
3. П - …
4. П - …
5. П - …

Паважаныя калегі! Я папрашу вас прадставіць ваша бачанне як  гэтыя 5 “П” расшыфроўваюцца.
(*Работа ў групах, на сталах лісты “Праект – гэта 5 “П”, у гэтыя лісты запісваюць)*
*Абмеркаванне і вывад***: (**на экране)

1. П – праблема
2. П – пректаванне
3. П – пошук інфармацыі

4. П – прадукт
5. П – прэзентацыя

*Ёсць і 6 "П" – гэта партфоліа праекта*, г.зн. папка, у якой сабраны ўсе матэрыялы. Зыходзячы з гэтага, і фарміруюцца этапы работы над праектам. (На экране).

Як гаворыцца ў вядомай прымаўцы "Цяжкі толькі пачатак" .Так і ў даследчай рабоце самае цяжкае – гэта выбраць тэму навучальнага даследавання ці праекта. Ад таго наколькі ўдала выбрана тэма залежыць 50% поспеху, а можа, і болей.

Чым жа кіруюся я пры выбары тэмы, я раскажу крыху пазней.

- А *зараз паспрабуйце , паважаныя, калегі, паспрабуйце сфармуляваць правілы выбару тэмы даследавання (*дыялог).

Я пры выбары тэмы даследавання сумесна з вучнямі кіруюся наступнымі крытэрыямі (на экране):

- Тэма павінна быць цікавая вучню.
- Тэма павінна быць такой, каб вучань змог яе выканаць.
- Раскрыццё тэмы павінна прынесці рэальную карысць удзельнікам даследавання.
- Тэма павінна быць своеасаблівай, арыгінальнай, у ёй павінен быць элемент нечаканасці, незвычайнасці.
- Тэма павінна быць такой, каб работа магла быць выканана адносна хутка.

Я таксама пастаянна сачу за тым, якія конкурсы аб'яўляюцца навукова-метадычнымі выданнямі, напрыклад, часопісам "Роднае слова", Вузамі, цікаўлюся правядзеннем Інтэрнет-конкурсаў. І гэта нам падказвае цікавыя тэмы для работы.

Вось, напрыклад, Інстытут тэалогіі імені Святых Кірылы і Мяфодзія пры БДУ аб'явіў рэспубліканскі конкурс "Біблейскія сюжэты ў сусветным мастацтве". І мы вырашылі прыняць удзел у гэтым конкурсе, вызначыўшы тэму для даследавання "Цудатворныя абразы Беларусі". Гэтая работа пазней была адзначана Дыпломам ІІІ ступені.

Перш чым перайсці да праектавання, трэба прадставіць гіпотэзу, паставіць мэту і вызначыць, рашэннем якіх задач можна гэтай мэты дасягнуць, і даказаць ці абвергнуць прадстаўленую гіпотэзу.

Пры вызначэнні мэты даследавання неабходна адказаць на пытанні:
-Які рэзультат мы хочам атрымаць?
-Якім бачыцца рэзультат да яго атрымання?

Пад задачамі даследавання падразумеваецца тое, што можна зрабіць для дасягнення мэты (*вывучыць…., прааналізаваць…, параўнаць…, выявіць…, раскрыць…, сістэматызаваць…, супаставіць…, даследаваць з пазіцыі…, раскрыць…, суаднесці…., сабраць…).*

- *Як нараджаюцца гіпотэзы?*

Гіпотэзы ўзнікаюць як магчымыя варыянты рашэння праблем, затым гэтыя гіпотэзы правяраюцца ў час даследавання.

Гіпотэзы павінны адпавядаць патрабаванням:

- Утрымліваць меркаванне.
- Яе можна праверыць.
- Яна павінна быць несупярэчлівай.
- Адпавядаць фактам.

*("Калі…, то"; "так…, як…", "пры ўмове, што…").*

А вось ва ўменні выпрацаваць гіпотэзу, мэту і задачы можна зараз патрэніравацца. Зараз мы з вамі гэта зробім. І так, уявім, што мы выбралі тэму даследавання "Цудатворныя абразы Беларусі".

*-Паспрабуйце да дадзенай тэмы сфармуляваць гіпотэзу, мэту і задачы.*
*(Работа ў групах, супастаўленне са сваёй работай).*
Пры выкананні любой праектна-даследчай работы адзін з найважнейшых пытанняў:

- Дзе знайсці патрэбную інфармацыю?
- Якія крыніцы могуць быць для гэтага выкарыстаны?

Канечне, гэта залежыць ад выбранай тэмы.

Давайце разам падумаем, якімі крыніцамі інфармацыі можна карыстацца пры рабоце над гэтай жа тэмай даследавання “Цудатворныя абразы Беларусі”.*(Дыялог).*

Гіпотэзы, мэты, задачы сфармуляваны, сабрана патрэбная інфармацыя і пачынаецца самы важны этап: абагульненне і апрацаванне атрыманых дадзеных. У вучняў гэта звычайна выклікае цяжкасці. І я ўпэўнена, што тут без дапамогі педагога вучню не абысціся. Многае можна спрасціць, калі папярэдне абмеркаваць тое, як будуць прадстаўлены рэзультаты даследавання, у якім выглядзе будзе рэалізаваны праект. Вынік даследавання можа быць прадстаўлены ў выглядзе :(на экран)

- Справачнік, газета, журнал, буклет, слоўнік, альманах;
- Альбом;
- Экскурсія;
- Гульня;
- Сцэнарый свята;
- Касцюм, макет, мадэль, сувенір;
- Мультымедыйны праект;
- Вучэбны дапаможнік і т. д.

Я практыкую такія формы:

- Слоўнік;
- Фотаальбом;
- Буклеты;
- Відэафільмы;
- Рэфераты;
- Распрацоўка сцэнарыяў.

І гэта можна ўбачыць, паважаныя калегі на міні-выставе.

Напрыклад, у час работы над даследчым праектам “Духоўная спадчына майго краю” мы з вучнямі на аснове сабранага мясцовага матэрыялу распрацавалі сцэнар фальклорнага свята “Сватанне” і з удзельнікамі фальклорнага клуба “Купалінка” дадзеную пастаноўку прадставілі ўвазе гімназістаў, настаўнікаў і бацькоў. І я хачу адзначыць, што вучні з вялікім інтарэсам і жаданнем распрацавалі гэты сцэнарый, рэпеціравалі і вытупалі на сцэне.(*Фота сваты)*

Можна распрацаваць цікавы праект, можна падрыхтаваць у цікавай форме рэзультат даследавання, але калі не надзяліць увагай такі этап як “абарона вучэбнага праекта”, то можна лічыць даследаванне незавершаным.

Абарона – вяршыня даследчай работы і адзін з галоўных этапаў навучання юных даследчыкаў. Пра выкананую работу трэба не толькі расказаць, але яе, як і ўсякае даследаванне, трэба абараніць.

У ходзе абароны вучань вучыцца паказваць тую інфармацыю, якую здабыў, сутыкацца з іншымі поглядамі на праблему, вучыцца даказваць свой пункт погляду, вучыцца адказваць на пытанні.

Трэба сказаць, калі вучань упэўнена і паспяхова прайшоў усе этапы даследавання, калі валодае матэрыялам, то і ў час абароны ён трымаецца ўпэўнена і спакойна, не баіцца пытанняў членаў эксперцнага савету, можа адстаяць свой пункт погляду.І яшчэ па сваім вопыце ведаю, што важна вельмі – гэта настроіць вучня псіхалагічна да публічнай абароны, таму мы цесна супрацоўнічаем з педагогам-псіхолагам у час падрыхтоўкі да абароны работы.

Немалаважным момантам любой дзейнасці і праектна-даследчай асабіста з’яўляецца ацэнка выкананай работы. Прычым неабходна ацаніць не толькі канчатковы рэзультат, але і ўвесь ход работы над вучэбным даследаваннем.

*-Якія ж крытэрыі ацэнкі эфектыўнасці праектна-даследчай дзейнасці?*

Я, паважаныя калегі, прапаную сумесна сфармуляваць гэтыя крытэрыі. Для гэтага вы можаце абмеркаваць усё разам і выпрацаваць крытэрыі.

*(Работа ў групах) А на дошку вывешваюцца рэзультаты.*

*А потым на экране м.б.*

- Самастойнасць работы над вучэбным праектам;
- Абаснаванне выбара тэмы і яе актуальнасць;
- Практычная значнасць работы;
- Арыгінальнасць рашэння праблемы;
- Артыстызм і выразнасць выступлення;
- Глыбіня і шырыня ведаў па праблеме;
- Кампетэнтнасць дакладчыка;
- Выкарыстанне нагляднасці і тэхнічных сродкаў.

У сваёй практыцы я часта выкарыстоўваю метад як “ПАПС" – формула - метад “, ён выкарыстоўваецца тады, калі трэба, каб кожны заняў вызначаную пазіцыю і змог выразіць свае меркаванні ў сціслай і дакладнай форме. Схема работы наступная :(*на экране)*

**П-** пазіцыя (у чым заключаецца пункт погляду), я лічу, што…

**А** – абаснаванне (доказы ў падтрымку пазіцыі) - … таму, што…

**П** – прыклад (факты, якія ілюструюць доказ) - … напрыклад: …

**С** – сродак (вывад, заклік да прыняцця пазіцыі) - … таму …

І так наш занятак падыхоходзіць да заканчэння, падвесці вынік і правесці рэфлексію я прапаную менавіта ў такой форме. Паважаныя калегі, я спадзяюся, што мой вопыт па арганізацыі праектна-даследчай дзейнасці, мае рэкамендацыі па яе арганізацыі паспрыялі таму, што вы актыўней будзеце ў сваёй практыцы прымяняць менавіта праектна-даследчую дзейнасць. І зараз з дапамогай ПАПС метада я папрашу выказаць сваю пазіцыю ў адносінах да праектна-даследчай дзейнасці.

*(Абмеркаванне і агучванне).*

А на завяршэнне я звяртаюся да нашага *дрэва дасягненняў***.** Жадаю вам поспехаў у даследчай дзейнасці, і гэта, канечне, абавязкова папоўніць наша дрэва дасягненняў.

Вялікі дзякуй за сумесную працу, і ў знак павагі я прэзентую вам буклет па арганізацыі праектна-даследчай дзейнасці.